View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# АДУКАЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914 – 1918 ГГ.)

П. А. Трубчык, г. Мінск

Напярэдадні Першай сусветнай вайны сістэма адукацыі на тэрыторыі сучаснай Беларусі адрознівалася шматтыпнасцю школ, падначаленнем навучальных устаноў розным ведамствам, наяўнасцю дзяржаўных і прыватных сярэдніх школ, саслоўна-класавым характарам сярэдняй і вышэйшай адукацыі, вызначаным абмежаваннем для асоб жаночага полу ў атрыманні вышэйшай адукацыі.

Пачатковую адукацыю давалі народныя і гарадскія вучылішчы, якія адносіліся да Міністэрства народнай асветы, а таксама царкоўнапрыходскія школы і школы пісьменнасці, што падпарадкоўваліся Сіноду. У 1914 г. у паўночна-заходніх губернях налічвалася 4784 вучылішчаў (з іх 531 двухкласавыя) з 304745 навучэнцамі, і 2813 царкоўнапрыходскіх школ, дзе вучыліся 136900 чалавек. Сярэдняя адукацыя развівалася больш марудна ў параўнанні з пачатковай. Па дадзеных на 1914 г. на тэрыторыі Беларусі было 13 мужчынскіх і 17 жаночых урадавых гімназій, 7 рэальных і 1 камерцыйнае вучылішча, 16 мужчынскіх і 23 жаночыя прыватныя школы І разраду, 5 мужчынскіх і 40 жаночых – ІІ разраду. Усяго ж ва ўрадавых і прыватных сярэдніх навучальных установах было толькі 31328 чалавек, у той час як у краі пражывала 8,5 млн. чалавек. Таксама пашыралася сетка сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, галоўнае месца па колькасці сярод якіх займалі настаўніцкія семінарыі, што выпускалі настаўнікаў для пачатковых школ. З 1909 па 1916 гг. было адкрыта 5 настаўніцкіх семінарый: у Рагачове (мужчынская) і 4 жаночыя ў Оршы, Барысаве, Гомелі і Бабруйску. Пачалі працаваць тры настаўніцкія інстытуты: у Віцебску – у 1910 г., Магілёве – 1913 г., Мінску – 1914 г. Настаўніцкія інстытуты не з'яўляліся вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, аднак праграма навучання ў іх была больш разгорнутай, чым у семінарыях. Яны рыхтавалі настаўнікаў для пачатковых школ павышанага тыпу. Выкладчыкі Мінскага настаўніцкага інстытута ў сваёй педагагічнай дзейнасці арыентаваліся ў асноўным на ўзровень сярэдняй школы. Педагагічных навучальных устаноў па падрыхтоўцы настаўнікаў для гарадскіх вучылішчаў і сярэдніх школ на тэрыторыі Беларусі не было. Настаўнікаў для іх прысылалі з Вільні, Масквы, Пецярбурга [1, с. 14, 15, 18]. У цэлым жа, нягледзячы на пэўныя зрухі ў галіне народнай асветы, на пачатку Першай сусветнай вайны Беларусь саступала цэнтральным губерням Расійскай імперыі па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню школы, некаторых іншых важных паказчыках развіцця адукацыі.

З лета 1915 г. тэрыторыя Беларусі апынулася ў зоне непасрэдных ваенных дзеянняў. У жніўні 1915 г. германскае камандаванне распачало імклівы і паспяховы наступ у напрамку Коўна – Вільня – Мінск. 31 жніўня расійская армія была вымушана пакінуць Свянцяны і Вілейку, а ў пачатку верасня – Вільню, Гродна, Ліду і Брэст. Цаной вялікіх страт і намаганняў расійская армія здолела спыніць германскі наступ. З надыходам восені актыўнасць ваенных дзеянняў знізілася, і ў кастрычніку 1915 г. фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск. Такім чынам, у выніку летневосеньскіх ваенных дзеянняў на тэрыторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусі пад германскай акупацыяй апынулася амаль палова тэрыторыі краю – заходняя частка Мінскай, амаль уся Віленская і Гродзенская губерні.

З пачаткам Першай сусветнай вайны ўстановы адукацыі на тэрыторыі Беларусі апынуліся ў цяжкім становішчы. У сувязі з акупацыяй нямецкімі войскамі значнай часткі тэрыторыі Беларусі шмат сярэдніх і спецыяльных навучальных устаноў, вышэйшых пачатковых вучылішчаў, настаўніцкіх семінарый было эвакуіравана ў Магілёўскую і Віцебскую губерні альбо ў глыб Расіі, дзе працавалі другая і трэцяя змены мясцовых школ. Мінскі настаўніцкі інстытут быў эвакуіраваны ў Яраслаўль. Пачатковыя школы ў зоне ваенных дзеянняў былі закрытыя альбо занятыя пад шпіталі. Большасць пачатковых і сярэдніх школ на акупіраванай немцамі тэрыторыі спыніла сваю працу.

Для падрыхтоўкі настаўнікаў для беларускіх школ нямецкія акупацыйныя ўлады адкрылі ў кастрычніку 1916 г. беларускую настаўніцкую семінарыю ў Свіслачы, што на Гродзеншчыне, дзе да 15 лістапада 1918 г. тут атрымалі падрыхтоўку 144 настаўнікі беларускіх школ. Сетка беларускіх пачатковых школ на ўсёй акупіраванай немцамі тэрыторыі вырасла з 8 у кастрычніку 1916 г. да 50 у снежні 1917 г. і дасягнула 89 вясной 1918 г. Пераважна яны размяшчаліся на тэрыторыі Беластоцка-Гродзенскай акругі [2, с. 17]. Тут таксама дзейнічала 13 беларускіх гімназій і прагімназій.

Нямецкая акупацыйная палітыка на Беларусі ў культурна-асветніцкай галіне была накіравана на падрыў царскай школьнай палітыкі. Уводзілася абавязковае выкладанне на роднай мове. Такі парадак павінен быў захоўвацца і пры вывучэнні рэлігіі. Усім нацыянальнасцям была дазволена культурна-асветніцкая дзейнасць і выданне газет на роднай мове. У гэты час адкрыліся беларуская бібліятэка і кнігарня, паступова развівалася выдавецкая дзейнасць, асабліва па выданні падручнікаў і школьнай літаратуры. У 1916 г. было выдадзена 7 беларускіх кніжак, у 1918 г. іх колькасць узрасла да 28 [2, с. 16, 17]. Зразумела, што ствараючы ўсё гэта Германія кіравалася найперш сваімі дзяржаўнымі інтарэсамі, тым не менш гэтыя мерапрымствы садзейнічалі развіццю беларускай культурна-асветніцкай дзейнасці.

Пачатак Першай сусветнай вайны патрабаваў умацавання патрыятычнага выхавання ў навучальных установах. Папячыцель Віленскай навучальнай акругі прапанаваў шырэй выкарыстоўваць у школе рускія народныя інструменты, знаёміць навучэнцаў з рускімі народнымі песнямі. Падрыхтоўка будучых настаўніц у Барысаўскай настаўніцкай семінарыі мела на мэце выхаваць у іх любоў да Радзімы, павагу да яе гістарычнага мінулага, нацыянальных рускіх каштоўнасцей. Ажыццяўленню задач выхавання ў нацыянальным духу, на думку вучэбнай адміністрацыі, садзейнічалі знаёмства з Расіяй, з мясцовым краем шляхам экскурсій, вывучэнне ў большым аб'ёме роднай гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, рускай мовы [3, с. 191].

Ваенныя падзеі прывялі да пашырэння нацыянальнага складу навучэнцаў, ліквідацыі некаторых абмежаванняў этнічнага характару. 10 жніўня 1915 г. Міністэрствам народнай асветы быў дазволены прыём ва ўсе навучальныя ўстановы імперыі дзяцей вайскоўцаў, а таксама ўдзельнікаў вайны, дэмабілізаваных з-за раненняў ці хваробы, без адрознення нацыянальнасцей і веравызнанняў. Акрамя таго, у навучальныя ўстановы дапускаліся дзеці служачых сістэмы народнай асветы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іудзейскага веравызнання незалежна ад усталяванай працэнтнай нормы яўрэяў (правілы прыёму ў навучальныя ўстановы ўсталёўвалі норму для яўрэяў у сярэдніх навучальных установах у раёне мяжы яўрэйскай аселасці 15 %). Ва ўмовах вайны меў месца факт прёму ў Віцебскі настаўніцкі інстытут беларуса-католіка, хаця раней настаўніцкія інстытуты прызначаліся выключна для асоб праваслаўнага веравызнання [3, с. 191].

Першая сусветная вайна паказала расійскім кіруючым колам неабходнасць рашучага павароту да праблем нацыянальнай адукацыі. Пад кіраўніцтвам міністра народнай асветы П.М. Ігнацьева, які займаў гэту пасаду ў студзені 1915 – снежні 1916 г., быў распрацаваны праект рэформы сістэмы адукацыі ў дзяржаве. Праект прадугледжваў, што абноўленая школа павінна быць накіравана на выхаванне ў вучняў агульнарасійскай нацыянальнай самасвядомасці. У структуры школьнага вучэбнага плана дамінавала руская мова і літаратура, гісторыя і геаграфія Расіі. Нярускім народнасцям давалася магчымасць засваення, у тым ліку і ў сярэдняй школе культурнай спадчыны сваіх народаў. Але праекты П.М. Ігнацьева былі адхілены ўрадам, а сам ён быў вымушаны пайсці ў адстаўку.

Прыйшоўшы да ўлады ў выніку Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г., Часовы ўрад адмяніў шэраг састарэлых, антынародных распараджэнняў царскіх улад у галіне асветы і школы. У прыватнасці, былі адменены ўрадавыя і міністэрскія дырэктывы, указанні аб забароне настаўнікам ствараць саюзы і праводзіць сходы, аб строгіх абмежаваннях педагагічных курсаў і з’ездаў. Былі ануляваны абмежаванні правоў на адукацыю і педагагічную працу па расавых, нацыянальных і рэлігійных прызнаках, у тым ліку дыскрымінацыйныя, антысеміцкія цыркуляры афіцыйных органаў аб недапушчэнні яўрэяў да педагагічнай дзейнасці, строгім абмежаванні адукацыі дзяцей яўрэйскай нацыянальнасці ў сярэдніх навучальных установах. Таксама, Часовы ўрад прыняў рашэнне аб развіцці настаўніцкіх семінарый і інстытутаў, сварыў камісію па рэформе вышэйшай школы, большасць рашэнняў і рэкамендацый якой не была, аднак, рэалізавана [4, с. 170, 171].

Баявыя дзеянні і акупацыя значнай часткі тэрыторыі Беларусі нямецкімі войскамі ў гады Першай сусветнай вайны стварылі новыя геапалітычныя ўмовы для правядзення школьнай палітыкі царскага ўрада ў заходніх губернях імперыі. Вымушаны ўлічваць такую сітуацыю, царызм стаў на шлях пэўнай лібералізацыі сваёй школьнай палітыкі. Але прынцыповых перамен у ажыццяўленні школьнай палітыкі як збоку царызму, так і Часовага ўраду не адбылося. Пэўныя рэформы, распачатыя пад уплывам новай геапалітычнай сітуацыі не былі паўсюдна праведзены.

Літаратура і крыніцы

1. Снапкоўская, С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX−пачатку XX стст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : НІА, 1998. – 192 с.
2. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. − Мінск : Беларусь, 1993. − 320 с.
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кн. – Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 584 с.
4. Паначин, Ф. Г. Учительство и революционное движение в России (XIX−начало XX в.) : Ист. очерки. / Ф. Г. Паначин. – М. : Педагогика, 1986. – 21 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ